Кавалёва В.А., студ. гр. 514 ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуцько В.Л.,
ст. выкладчык, канд. культуралогіі

# СВЯТА КАЗАНСКАЙ ІКОНЫ БОЖАЙ МАЦІ ЯК ФЕНОМЕН ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свята Казанскай іконы Божай Маці праводзіцца штогод 4 лістапада. Казанская ікона – вельмі распаўсцюджаны вобраз на Беларусі. Не шмат знойдзецца людзей, якія б не ведалі аб існаванні гэтай святой іконы і не мелі б яе ў сваім доме. Казанская ікона ўваходзіць у лік цудадзейных. Самай галоўнай прычынай, якая падштурхнула нас на арганізацыю свята, стала ўспрыманне Казанскага вобраза Божай Маці як ахоўніцы студэнцтва. Сапраўды, на свяце ў Жыровіцкім манастыры ўдзельнічала шмат студэнтаў з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Мінскіх Духоўных Акадэміі і Семінарыі.

Свята адбылося на тэрыторыі Жыровіцкага манастыра. Шэраг мерапрыемстваў праходзіў у Мінскай Духоўнай Семінарыі. Гэта была першая сумесная работа з удзельнікамі некалькі навучальных устаноў і духоўных цэнтраў Беларусі. У мерапрыемстве прымалі ўдзел: кіраўніцтва Мінскіх Духоўных Акадэміі і Семінарыі, прыход Архангела Міхаіла вёскі Новый Двор, духоўны хрысціянскі тэатр “Анёл” кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўнівевсітэт культуры і мастацтваў”. На правядзенне свята было атрымана благаславенне Мітрапаліта Філарэта.

Для арганізацыі свята быў праведзены этап падрыхтоўчай работы, падчас якой склаўся шэраг пытанняў і цяжкасцей. Напрыклад, адной з праблем было афармленне афіцыйных запытаў, якія былі неабходны ад абоіх бакоў. Урэшце, задума аб правядзенні свята была падтрымана згодай Філарэта, мітрапаліта Мінскага і Слуцкага і пачалася падрыхтоўка да свята з мая 2010 года. Былі праведзены сумесныя рэпетыцыі з удзельнікамі двух

устаноў – студэнтамі ўстановы адукацыі “ Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” і ўстановы адукацыі “Мінская Духоўная Семінарыя”.

4 лістапада 2010 года свята пачалося а сёмай гадзіне раніцы, калі адправіліся ўсе ўдзельнікі і госці на аўтобусе ў Жыровіцы. Падарожжа пачалося з малітвы-благаславення на добры шлях. У ціхі, ад гарадскіх шумоў, пасёлак прыехалі аўтобусы з Мінску і Петрыкава. Адзначым, што з Петрыкава на свята прыехалі навучэнцы спецыяльнага тэхничнага вучылішча №1 зачыненага тыпу. Усіх сустракалі хлопцы- семінарысты з брацтва св. Еўфрасінні Полацкай.

У дзесяць гадзін раніцы пачалася святочная Літургія ў галоўным Саборы манастыра ў гонар Успенія Божай Маці. Набліжаючыся да храму, мы чуем гукі благавесту. Паветра, быццам напоўнена голасам вялікага колакалу, да якога хутка далучаецца перазвон іншых колакалаў. Набажэнства распачало свята. Пасля сумеснай малітвы ўсіх гасцей чакала экскурсія па храмах манастыра, дзе семінарысты паведамілі гісторыю святых мясцін, расказалі аб цудоўным з’яўленні Жыровіцкай іконы. Кожны меў магчымасць дакрануцца душой да святыні, пакланіцца святому вобразу і паведаміць аб сваіх слёзах і радасцях Прысвятой Дзеве Марыі. Пасля заканчэння экскурсіі ўсіх запрасілі ў манастырскую трапезную пачаставацца ежай, якую звычайна ўжываюць манахі абіцелі. Працягам свята было наведванне святой крыніцы, дзе кожны змог папіць святой вады і акунуцца ў купелі, адчуць сілу Жыровіцкай зямлі. Прагучаў і канцэрт калакольнага звону ў выкананні семінарыстаў.

У праваслаўнай традыцыі звон мае не толькі значэнне сігналу, заклікаць да малітвы, але і настройвае чалавека на пэўны лад, які выклікае глыбокія перажыванні зварота да Вышэйшых сіл. Лічыцца, што калакольны звон ачышчае паветра і душу чалавека ад благога. Нездарма звон называюць "гукавым сонцам", Дабравест.

Пасля падорожжа па святым месцам Жыровічаў госці вярнуліся ў семінарыю, дзе ўсіх чакала тэатралізаваннае прадстаўленне з удзелам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заслужанай артысткі РБ Рыммы Фёдараўны Маленчанка, зводнага хору Мінскай Духоўнай Семінарыі і рэгенцкага аддзялення, Духоўнага Хрысціянскага тэатра “Анёл”. Усе нумары былі пабудаваны, як шанаванне і ўсхваленне Казанскай Іконы Божай Маці. Усе выкарыстаныя сродкі мастацкай выразнасці – паэтычнае слова, акадэмічныя шматгалосныя спевы, касцюміраваныя шэсці, інструментальная музыка, мезансцэніраванне адпавядалі ідэі спасціжэння хрысціянскіх ідэалаў і каштоўнасцей.

Пасля заканчэння эмацыянальнага відовішча, студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў змаглі пазнаёміцца з інтэр’ерам семінарскіх аўдыторый, дзе займаюцца студэнты, пакоямі інтэрната, дзе яны жывуць і адпачываюць. Усе госці былі ў захапленні ад убачанага. Сумесная трапеза ў семінарскай сталовай была фінальнай кропкай свята. На развітанне студэнты семінарыі выканалі для гасцей і моладзі традыцыйнае для Праваслаўнай Царквы пажаданне “Многая лета”.

У заканчэнні артыкула неабходна падвесці вынікі аб правядзенні свята ў гонар Казанскай Іконы Божай Маці:

- Упершыню свята ажыццявілася сумесна двума ўстановамі адукацыі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і Мінскія Духоўныя Акадэмія і семінарыя пры падтрымцы Мінскай Епархіі.
- Свята Казанскай Іконы Божай Маці выйшла за межы Літургічных дзей пашырыла маштаб святкаванная.
- Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў змаглі пазнаёміцца з побытамі і звычаямі семінарыстаў.
- Сучасная моладзь і дарослыя людзі падчас правядзення свята далучаліся да традыцый хрысціянскай царквы, яе маральна-этычных прынцыпаў, нормы паводзін і ідэалаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Мень, А. Таинство, слово и образ: Богослужение Восточной Церкви. / А. Мень – Брюссель: Жизнь с богом, 1980. – 285 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Православие и Мир. [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pravmir.ru/printer_1434.html. – Час доступу: 05. 04. 2011.

3. Чудеса Богородицы. [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://богородица-храм.рф/node/51. – Час доступу: 05. 04. 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ